Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя № 11 (27)

■ Тэма нумара

# СМЕЦЦЕВЫ КАЛАПС: РЭАЛЬНАЯ ПАГРОЗА?

## Як у нашай краіне вырашаецца праблема з утварэннем і ўтылізацыяй адходаў

**Рост колькасці адходаў — сёння адна з самых актуальных праблем у многіх краінах. Нават Сусветны акіян не ўбярогся ад гэтага бедства — па ацэнках вучоных, пластыкам забруджана больш за 88% яго паверхні. Як жа трэба падысці ў нашай краіне да абыходжання з адходамі, каб мінімізаваць іх магчымую экалагічную і эканамічную шкоду?**

### ЧЫСТА ТАМ, ДЗЕ ПРЫБІРАЮЦЬ?

На пачатку лістапада па распараджэнні міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя Худыка супрацоўнікі цэнтральнага апарату ведамства накіраваліся ў Гродзенскую вобласць, каб вывучыць сітуацыю па навядзенні парадку ў рэгіёне. Зразумела, «смеццевая праблема» была пад найбольш пільнай увагай спецыялістаў.

Так, інспектары, накіраваныя ў Зэльвенскі раён, адным з першых аб'ектаў наведалі палігон ЦКА «Валыневічы». Па словах майстра ўчастка добраўпарадкавання і саначысткі Зэльвенскага РУП ЖКГ Андрэя Цюхая, супрацоўнікі камунальнай службы не толькі сочаць за парадкам на аб'екце, але і актыўна займаюцца нарыхтоўкай другасных матэрыяльных рэсурсаў з адходаў, якія трапляюць на палігон. Апошнія накіроўваюцца на прадпрыемствы-перапрацоўшчыкі: макулатура трапляе на слонімскі кардонна-папяровы завод «Альберцін», шкло — на перапрацоўку ў Баранавічы, шыны — на ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» і інш.

Займаюцца ў раёне і рэкультывацыяй міні-палігонаў і ўнутрыгаспадарчых кар'ераў. Два такія аб'екты знаходзяцца каля вёскі Крывічы. Як расказаў начальнік землеўпарадкавальнай службы Зэльвенскага райвыканкама Вадзім Панасік, праца па рэкультывацыі міні-палігона пакуль не завершана, але аб'ект закрыты. Нягледзячы на гэта, падчас наведвання аб'ектаў недалёка ад палігона інспектары заўважылі невялікі сметнік — хтосьці з мясцовых жыхароў выкінуў бытавыя адходы і раслінныя рэшткі.

— На жаль, такія сітуацыі па-ранейшаму здараюцца, але адказныя службы раёна стараюцца аператыўна рэагаваць на іх і ліквідаваць гэтыя міні-звалкі, — адзначыў **начальнік Зэльвенскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Генадзь ЧЫГРЫН.**

На пад'ездах да некаторых палігонаў і міні-палігонаў дзе-нідзе трапляліся пустыя бутэлькі і іншае пластыкавае смецце. Такую ж карціну інспектары часам назіралі і ўздоўж дарог. Але калі ў першым выпадку гэта недапрацоўкі камунальнікаў, то ў другім — «падарункі» ад мясцовых жыхароў і гасцей раёна. Па словах Генадзя Чыгрына, кожныя два тыдні спецыялісты дарожнай службы праводзяць санітарны абход дарог, але ад гэтай праблемы толькі прыборкай смецця не пазбавіцца.



Фота БЕЛТА.

Па словах **начальніка ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Мінпрыроды Руслана МІХАЛЕВІЧА,** агульная сітуацыя з навядзеннем парадку на Гродзеншчыне больш-менш стабільная. Але, безумоўна, сустракаюцца ў рэгіёне населеныя пункты, дзе да праблемы адходаў адносяцца не так уважліва. Раскіданае смецце каля кантэйнераў, дрэнны санітарны стан апошніх, засілле раслінных рэшткаў, якія маглі б пайсці на кампаставанне, — усе гэтыя і іншыя праблемы сустракаюцца ў населеных пунктах. На аб'ектах жа захавання адходаў спецыялісты фіксуюць дрэннае ўтрыманне прылеглай тэрыторыі, адсутнасць агароджы, з-за чаго на палігоны бесперашкодна трапляюць свойскія жывёлы і іншыя няпрошаныя «наведвальнікі». Пакуль, на жаль, актуальная і праблема захавання на палігонах другасных матэрыяльных рэсурсаў.

— Галоўнай задачай масавага абследавання населеных пунктаў і спецыялізаваных аб'ектаў Гродзенскай вобласці было не выявіць негатыў, а знайсці раён, населены пункт, палігон, на які трэба раўняцца іншым, — падкрэсліў Руслан Міхалевіч. — Толькі пасля таго, як спецыялісты будуць ведаць, як трэба працаваць, мы зможам да іх працы прад'яўляць патрабаванні. Плануецца, што пры выяўленні паўторных выпадкаў на палігонах ЦКА будуць прымацца самыя вычарпальныя меры, аж да закрыцця аб'ектаў.

*По інфармацыі Мінпрыроды, на 1 верасня па краіне выяўлены 922 выпадкі захавання ДМР. Да адказнасці прыцягнуты 419 асоб, у тым ліку 327 службовых. Сума штрафаў па краіне склала 74,2 тыс. руб.*

*Але спецыялісты ўпэўнены: паступова колькасць парушэнняў экалагічнага заканадаўства памяншаецца. Гэтаму ў тым ліку садзейнічае стаўка кантралюючых органаў на маніторынг і растлумачальную працу з насельніцтвам і суб'ектамі гаспадарання. Землекарыстальнікі становяцца ўсё больш свядомымі ў гэтым пытанні, лічаць у Мінпрыроды.*

***(Заканчэнне на 8-й стар.)***

■ Актуаліі

# Перапіс... для ртуці

## Праекты міжнароднай тэхнічнай дапамогі па пытаннях абыходжання з вадкім металам у нашай краіне

**У 2014 годзе наша краіна падпісала Мінамацкую канвенцыю аб ртуці, але пакуль не ратыфікавала яе. Каб пачаць рэалізоўваць палажэнні гэтага міжнароднага дакумента, трэба прааналізаваць магчымасці нацыянальнага заканадаўства і правесці інвентарызацыю крыніц забруджвання ртуццю і яе злучэннямі. На гэта і накіраваны праекты міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Ратыфікацыя і пачатак рэалізацыі Мінамацкай канвенцыі аб ртуці ў Беларусі» і «Правядзенне першапачатковай ацэнкі ўмоў для рэалізацыі Мінамацкай канвенцыі ў Рэспубліцы Беларусь». Нацыянальным выканаўчым агенцтвам праектаў выступае Беларускае грамадскае аб'яднанне «Экалагічная ініцыятыва».**

Як адзначыў намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр Корбут, стаўшы падпісантам Мінамацкай канвенцыі аб ртуці, Беларусь яшчэ раз прадэманстравала, што яна ўдзяляе вялікую ўвагу праблеме неспрыяльнага ўплыву ртуці на здароўе чалавека і стан навакольнага асяроддзя. А рэалізацыя праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі будзе ў тым ліку садзейнічаць дасягненню мэт, устаноўленых Нацыянальнай стратэгіяй устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на перыяд да 2030 года.

**Сусветная супольнасць убачыла ўсю згубную моц ртуці і яе злучэнняў у 1956 годзе, калі больш за 1700 жыхароў Японіі пацярпелі ад уздзеяння метылату ртуці. У памяць аб ахвярах трагедыі — жыхароў рыбалавецкага пасёлка Мінамата — і быў названы міжнародны дакумент, накіраваны на ахову здароўя людзей і навакольнага асяроддзя ад антрапагенных выкідаў і вызваленняў ртуці і яе злучэнняў. Мінамацкая канвенцыя аб ртуці была падпісана ў 2013 годзе ў горадзе Кумамота. Работа ж па падрыхтоўцы канвенцыі і распрацоўцы яе палажэнняў пачалася ў 2003 годзе пры актыўным удзеле спецыялістаў з Швейцарыі і Нарвегіі. Набыла яна моц у жніўні 2017 года. У цяперашні час дакумент ратыфікавалі 84 краіны свету з 128 падпісантаў.**

— Мы распачынаем практычныя дзеянні, вынікам якіх стане ацэнка бягучай сітуацыі ў Беларусі ў сферы абыходжання з ртуццю, — расказала **намеснік старшыні Савета БГА «Экалагічная ініцыятыва» Вольга ВОЛКАВА.** — Неабходна ацаніць наступствы і перавагі ратыфікацыі канвенцыі, а таксама вызначыць прыярытэтныя кірункі дзейнасці на шляху да рэалізацыі палажэнняў Мінамацкай канвенцыі.

Па словах эксперта, у сукупнасці рэалізацыя праектаў разлічана на 2,5 года. Іх партнёрамі выступаюць міжнародныя арганізацыі UNITAR, UNEP, «Швейцарскі Зялёны крыж», Глабальны экалагічны фонд.

У нашай краіне вырашэннем праблемы негатыўнага ўздзеяння ртуці і яе злучэнняў пакуль сістэмна не займаюцца. Таму пасля ратыфікацыі Беларуссю Мінамацкай канвенцыі пры рэалізацыі яе палажэнняў неабходна будзе выканаць шэраг мер, накіраваных на прадухіленне і зніжэнне выкідаў забруджвальных рэчываў, якія змяшчаюць ртуць, спыненне вытворчасці некаторых вырабаў (асвятляльныя прыборы, медыцынскія інструменты і інш.), укараненне тэхналогій па бяспечным абыходжанні з ртуцьзмяшчальнымі адходамі.

Адной з самых важных частак рэалізацыі праектаў стане інвентарызацыя ўсіх запасаў ртуці, крыніц яе імпарту і экспарту, вызначэнне ўсіх вытворчых працэсаў, у якіх прымяняюцца ртуць або ртутныя злучэнні, выяўленне ўчасткаў, забруджаных ртуццю, вызначэнне колькасці і крыніцы ртутных адходаў і многае іншае.

**Вераніка КОЛАСАВА.** *kolasava@zviazda.by*

■ Экаініцыятыва

# КОЛЕР НАДЗЕІ

## ПРААН і Мінпрыроды пабудуюць «зялёныя» гарады



**Стварэнне разумных і «зялёных» гарадоў — актуальны трэнд для нашай краіны. Аднак не заўсёды навацыям лічаць патрэбным удзяляць увагу мясцовыя ўлады, а ў насельніцтва яшчэ цяжэй фарміруюцца экалагічна дружалюбныя паводзіны. Тым не менш у Беларусі ёсць гарады, якія ўжо маюць рэпутацыю актыўных і свядомых удзельнікаў праектаў, накіраваных на паляпшэнне стану навакольнага асяроддзя. Як гэта адбываецца на практыцы, расказала кіраўнік праекта ПРААН/ГЭФ «Падтрымка «зялёнага» горадабудаўніцтва ў малых і сярэдніх гарадах Беларусі («Зялёныя» гарады)» Ірына УСАВА.**

***— Праект «Падтрымка «зялёнага» горадабудаўніцтва ў малых і сярэдніх гарадах Беларусі» рэалізуецца з 2016 года. Ці атрымалася, на ваш погляд, за гэты час змяніць свядомасць людзей, данесці да іх каштоўнасці экалагічна дружалюбнага ладу жыцця?***

— Актыўную сваю фазу праект пачаў з сярэдзіны 2017 года. На дадзены момант немагчыма сказаць дакладна, наколькі атрымалася змяніць свядомасць жыхароў, бо актыўнае абмеркаванне планаў «зялёнага» горадабудаўніцтва пачнецца толькі ў 2018 годзе ў Полацку, Наваполацку і Навагрудку. Зараз Праект робіць акцэнт на правядзенне адукацыйных візітаў, семінараў і трэнінгаў з мэтай максімальна распаўсюдзіць сярод тэхнічных экспертаў, прадстаўнікоў гарадскіх адміністрацый, НДА, праекціроўшчыкаў, універсітэтаў, СМІ міжнародны вопыт «зялёнага» горадабудаўніцтва. Пакуль нам накіроўваюць пазітыўныя водгукі на мерапрыемствы, якія даюць магчымасць спецыялістам атрымаць новыя веды, змяніць сваё бачанне і падыходы да штодзённых абавязкаў. У Мінску 5—6 снежня 2017 года праект праводзіць сустрэчу для абмеркавання перспектыў развіцця «зялёнага» горадабудаўніцтва ў Беларусі, па выніках якой мы чакаем узгадненне кірункаў па гэтай тэматыцы, абмен вопытам з еўрапейскімі калегамі, вызначэнне бар'ераў і перспектыў.

***(Заканчэнне на 9-й стар.)***